Залічэнне вучняў у профільныя класы праводзіцца на конкурснай аснове па выніках навучання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі: адзнакі не ніжэй за 7 балаў па профільных вучэбных прадметах, сярэдні бал пасведчання аб агульнай базавай адукацыі – не ніжэй 7. У профільныя класы без уліку сярэдняга бала пасведчання аб агульнай базавай адукацыіі адзнак па профільных прадметах залічваюцца пераможцы трэцяга і заключнага этапаў рэспубліканскай алімпіяды па адпаведным (профільным) вучэбным прадметам.

Залічэнне ў X клас, у якім усе навучальныя прадметы вывучаюцца на базавым узроўні, ажыццяўляецца ў адпаведнасці з пунктам 94 Палажэння аб установе агульнай сярэдняй адукацыі.

**Пры фарміраванні X класа ва ўстанове адукацыі ўлічваецца:**

1) колькасць выпускнікоў IX класа, якія жадаюць працягнуць навучанне на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі;

2) колькасць патэнцыйных вучняў X профільнага класа і іх індывідуальных запытаў, патрэбнасцей і здольнасцей;

3) колькасць вучняў X класа, якія жадаюць вывучаць усе вучэбныя прадметы на базавым узроўні і (або), вывучаючы ўсе прадметы на базавым узроўні, асвойваць адукацыйную праграму прафесійнай падрыхтоўкі рабочых (служачых) (за кошт вучэбных гадзін факультатыўных заняткаў; магчымая арганізацыя навучання на базе ўстаноў прафесійна-тэхнічнай адукацыі).